Д. С. Палачанін

# БРАНІСЛАУ АДАМАВІЧ ТАРАШКЕВІЧ: АСНОУНЫЯ ВЕХІ ЖЫЦЦЯ

Браніслаў Адамавіч Тарашкевіч нарадзіўся ў засценку Мацюлішкі, што за 30 км на ўсход ад Вільні, (цяпер Літва) у сям'і каталіцкага селяніна-серадняка. З сямі гадоў Браніслаў дапамагаў бацьку з гаспадаркай, працаваў пастухом. У народным вучылішчы Браніслаў паказваў выдатныя вынікі. У 1906 г. паступіў у трэці клас 2-й Віленскай гімназіі. У гімназіі паказаў сябе добрым вучнем, меў сярэдні бал 4,3. У гімназіі Тарашкевіч трапіў ў студэнцкія згуртаванні, адным з такіх згуртаваннем была патрыятычна-незалежніцкая арганізацыя з клерыкальным адценнем "Вызваленне". Да гэтай арганізацыі належалі самыя перадавыя вучні гімназіі, але з рознымі жыццёвымі крэда, з рознымі, але талерантнымі поглядамі на нацыянальнае пытанне. Тарашкевіч трапіў у левае адгалінаванне гуртка, там цікавіўся палітычнай філасофіяй і эканомікай. У жніўні 1911 г. Б. Тарашкевіч апынуўся ў сталіцы Расіі і быў без перашкод прыняты на гісторыка-філалагічны факультэт Пецярбургскага ўніверсітэта, які скончыў у 1916 г., і быў пакінуты там пры кафедры рускай мовы і літаратуры. У 1913 г. пачаў працаваць над граматамі XII ст. Па загаду Шахматава ездзіў у Рыжскі архіў старажытных грамат. Працаваў над гістарычнай граматыкай беларускай мовы. Працаваў і як прыват-дацэнт старажытнагрэчыскай і лацінскай моў. Дакладна не вызначана навуковая ступень Б. Тарашкевіча. Не знойдзены дакументы аб атрыманні ім звання прафесара, але аб гэтым ёсць ускосныя сведчанні. Выступаў у беларускім друку з 1914 г. У 1917 г. ён стаў актыўным удзельнікам і адным з лідараў Беларускай сацыялістычнай грамады. У 1918 г., працуючы загадчыкам культурна-асветнага аддзела Белнацкама, падрыхтаваў і выдаў у Вільні першую «Беларускую граматыку для школ». У ёй аўтар абагульніў і замацаваў пісьмовыя традыцыі, што складаліся ў той час у выданні мастацкай, навукова-папулярнай і публіцыстычнай літаратуры, у пісьмовым друку; улічыў здабыткі тагачаснай лінгвістычнай навукі і вопыт папярэднікаў. Граматыка пасля вытрымала 6 перавыданняў і доўгі час была галоўным падручнікам па беларускай мове, асабліва ў часы беларусізацыі 1920-х гг. Знаходзіўся ў Мінску падчас абвяшчэння Беларускай Народнай Рэспублікі. У аўтабіяграфіі пазней пісаў, што ніколі не ўваходзіў ва ўрад, але і чужым у гэтых колах не быў. Палітычную пазіцыю Тарашкевіча на той час можна акрэсліць, як хістанне паміж прызнаннем рэвалюцыі, лаяльным супрацоўніцтвам з бальшавікамі і платформай беларускіх незалежнікаў. З 1921 г. – дырэктар Віленскай беларускай гімназіі. З 1921 па 1922 г. быў абраны паслом у польскі сойм, у 1922-1924 гг. быў старшынёй Беларускага пасольскага клуба. У першы перыяд сваёй парламенцкай працы трымаўся ў цэлым паланафільскай арыентацыі, хоць востра крытыкаваў з соймавай трыбуны нацыянальную і сацыяльную палітыку польскіх улад. Спрабаваў знайсці аб'ядноўваючы вектар для польскага і беларускага народаў. Пасля гэтага зблізіўся з левым крылом Беларускага пасольскага клуба. 24 чэрвеня 1925 г. выйшаў са складу Беларускага пасольскага клуба і заснаваў пасольскі клуб Беларускай сялянска-работніцкай грамады. Стаў старшынёй клуба, а пасля і створанай на яго аснове масавай палітычнай партыі. Шчыльна зблізіўся з лідарамі Камуністынай партыі Заходняй Беларусі і ў студзені 1926 г. быў прыняты ў яе члены. У студзені 1927 г. быў арыштаваны польскімі ўладамі, а ў маі 1928 г. асуджаны на 12 год зняволення. У гэты м жа годзе абраны акадэмікам Беларускай Акадэміі навук. У 1929 г. тэрмін зняволення быў зменшаны да 8 гадоў, а ў маі 1930 г. Тарашкевіч быў датэрмінова выпушчаны з астрога. Жыў у Гданьску. У лютым 1931 г. арыштаваны польскімі ўладамі пры спробе праехаць праз польскую тэрыторыю з Гданьска ў Берлін. У лістападзе 1932 г. асуджаны на 8 год катаржнай турмы. З верасня 1933 г. у выніку абмену палітзняволенымі, выехаў у СССР. 6 мая 1937 г. арыштаваны. 5 студзеня 1938 г. «двойкай» НКУС і Пракуратуры СССР прыгаворany да расстрэлу. Як сцвярджае афіцыйная версія, ён быў расстраляны. Рэабілітаваны ў 1957 г. Такім чынам, жыццё і дзейнасць Б.А. Тарашкевіча з'яўляюцца прыкладам самаадданага служэння сваёй Айчыне.

1. Ліс, А. С. Браніслаў Тарашкевіч/ А.С. Ліс. – Мінск: Навука і тэхніка, 1966.
2. https://ru.wikipedia.org/wiki/Тарашкевич

*Полочанин Дмитрий Сергеевич,*, студент ФИТиУ, *lock_plock@mail.ru*
*Научный руководитель: Николаева Людмила Викторовна,*, зав.каф. гум. дисц., к.и.н., доцент.

Библиотека БГУИР